ЭКСКУРСІЙНЫ МАРШРУТ

# «Пясочнае ў гады ваеннага ліхалецця»



**Аўтары:** удзельнікі аб’яднання па інтарэсах “Літаратурнае краязнаўства” ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі” Янушка Іван, Лось Кірыл.

**Кіраўнік –**педагог дадатковай адукацыі Майсюк Алена Уладзіміраўна

**Мэта экскурсіі:** азнаямленне згераічным і шматпакутныммінулым аграгарадка Пясочнае (Капыльскі раён, Мінская вобласць), са старонкамі ваеннага жыцця яго славутых ураджэнцаў; далучэнне дзяцей і моладзі, а таксама ўсіх зацікаўленых асоб у працэс вывучэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і народнага подзвігу.

**Задачы:**

- ❖ Пазнаёміцьз падзеямі ваеннай гісторыі, з лёсам ураджэнцаў аграгарадка Пясочнае – герояў-змагароў  і ахвяр вайны.
- ❖ Развіваць цікавасць да краязнаўства і спрыяць  далучэнню да навукова-даследчай і пошукавай працы.
- ❖ развіваць экскурсійна-турыстычную дзейнасць ва ўстанове адукацыі;
- ❖ Спрыяць фарміраванню патрыятызму і актыўнай антываеннай пазіцыі.

**Тып экскурсіі:**абзорная, загарадная, комплексная

**Від экскурсіі:** пешаходная.

**Формы правядзення:** экскурсія да помнікаў ваеннай гісторыі, экскурсія-лекцыя з літаратурнымі хвілінкамі і праглядам відэаматэрыялаў.

**Часавая даўжыня** – 2 гадзіны 30 хвілін.

**Працягласць маршрута -**  720 м.

**Маршрут экскурсіі:**месца сустрэчы з групай – Мінская вобласць, Капыльскі раён, аг. Пясочнае, вул. Леніна, 10.

ДУА "Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі – Таполя, пасаджаная ў гонар вучонага, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны С. А. Умрэйкі - Воінскае пахаванне і помнік "Смуткуючая маці" – Мемарыяльная дошка на месцы масавага растрэлу членаў партызанскіх сем'яў– Песачанскія могілкі (магіла ўдзельніка Лаўскага боя Астрэйкі В. М. і паэта-песенніка А.Русака) - Краязнаўчы музей ДУА "Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі".

**Апісанне тэрыторыі**. Тэрыторыя экскурсіі знаходзіцца ў сельскай мясцовасці – аг. Пясочнае Капыльскага раёна, Мінскай вобласці. Маршрут прайшоў вывучэнне і апрабацыю. Маршрут бяспечны пры ўмове ведання і выканання правілаў бяспечных паводзін пешаходаў.

**Змест экскурсіі:**

Пясочнае займае ў гісторыі Капыльшчыны адметнае месца.Найбольш цяжкія, жахлівыя старонкі біяграфіі Пясочнага прыпадаюць на гады Вялікай Айчыннай вайны. Ужо ў 1942 годзе ўсе мужчыны, хто мог насіць зброю, ваявалі ў партызанскіх атрадах і на фронце. Пясочнае называлі Партызанскай Масквой. Песачанцы пастаянна аказвалі матэрыяльную дапамогу партызанам. Менавіта кантакты з насельніцтвам, умела прадуманая агітацыйная работа дапамагала партызанам паспяхова граміць ворага.

У цэнтры аг. Пясочнае размешчаны мемарыяльны комплекс – брацкія могілкі, помнік "Смуткуючая маці". Тут пахаваны 12 партызанаў 300-й брыгады імя Варашылава, 27-й брыгады імя Чапаева і адзін чырвонаармеец, якія загінулі ў 1942-1944 гадах. На мемарыяных плітах - імёны182-х чалавек, загінуўшых на фронце і на акупіраванай тэрыторыі. Штогод 9 мая тут праходзіць мітынг, прысвечаны Дню Перамогі.

Фашысты не раз ўчынялі крывавыя расправы над мірнымі жыхарамі: здзекваліся з яўрэяў( у Пясочным было гета), выслежвалі партызанскія сем'і і распраўляліся з імі. Пра адну з такіх карных аперацый нямецкіх акупантаў раскажуць экскурсаводы ля мемарыяльнай дошкі Песачанскага палаца культуры і дасуга.

Пясочнае – малая радзіма вядомых паэтаў-песеннікаў. Адам Русак – аўтар вядомай "Лясной песні". Анатоль Астрэйка ў гады вайны працаваў адказным сакратаром у легендарнай газеце-плакаце "Раздавім фашысцкую гадзіну". Анатоль Вялюгін назваўвершы Анатоля Астрэйкі"лірычным толам", якія "крышаць у немцаў рэйкі". У 1943 годзе слуцкія падпольшчыкі ў падпольнай друкарні выпусцілі кнігу вершаўАстрэйкі "Слуцкі пояс". Адзін экзэмпляр захоўваецца ў музеі ўстановы адукацыі.

Назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю партызанскай славы мужныя героі Лаўскага бою. Сярод іх - Астрэйка Васіль Міхайлавіч,пахаваны на песачанскіх могілках.3 снежня 1942 года 18 партызан на працягу 4 гадзін адбілі 8 атак фашысцкага батальёна, сарвалі намер ворага нанесці раптоўны удар па партызанскай брыгадзе, аднак былі акружаны і ўсе загінулі ў няроўным баі.

У краязнаўчым музеі ўстановы адукацыі можна разгледзець знаходкі з месцаў былых баёў, азнаёміцца з біяграфіямі гераічных абаронцаў Капыльшчыны, прачытаць ўспаміны людзей, перажыўшых вайну.

Ва ўстанове адукацыі "Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі" вядзецца змястоўная краязнаўчая работа. На аснове пошукава-даследчай дзейнасці краязнаўцаў распрацаваны дадзены маршрут экскурсіі – "Пясочнае ў гады ваеннага ліхалецця"

Падчас экскурсіі наведвальнікі не толькі знаёмяцца з гістарычнымі фактамі, але і бачаць, як захоўваецца гістарычная спадчына малой радзімы.

**Практычнае значэнне:**

дадзены матэрыял не толькі экскурсійны, але і навучальны, выхаваўчы.

Выкарыстоўваецца на ўроках гісторыі, грамадазнаўства,  для правядзення класных гадзін і выхаваўчыхмерапрыемстваў.

**Агульныя метадычныя ўказанні па тэме экскурсіі :**

- музейна-педагагічная падрыхтаванасць экскурсаводаў;

- гістарычна- краязнаўчая падрыхтаванасць экскурсаводаў.

**Агульныя арганізацыйныя указанні:**

- інструктаж па правілам бяспечных паводзін падчас экскурсійнага маршрута;

- безумоўнае выкананне правіл бяспечных паводзін падчас маршрута ўсімі ўдзельнікамі.

**Уступ да экскурсіі:**

знаёмства з групай, паведамленне аб тэме, мэце экскурсіі, паведамленне аб ходу экскурсіі, праверка ведаў правіл бяспекі пешаходаў; працягласць – 5 мінут.

**Заключэнне:**

адказы на пытанні ўдзельнікаў, запіс у кнізе водгукаў аб уражаннях, заўвагах і прапановах; працягласць – 10 мінут.

# Тэхналагічная карта маршрута экскурсіі

# “Пясочнае ў гады ваеннага ліхалецця”

| Маршрут | Месца прыпынку | Аб’ект паказу | Працягласць паказу | Найменне падтэмы і асноўныя пытанні | Арганізацыйныя пытанні | Метадычныя ўказанні |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Уступ | | | | | | |
| аг. Пясочнае, ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі” | Фае ўстановы адукацыі | Установа адукацыі аг. Пясочнае. | 5 хвілін | “Уводзіны”<br><br>Знаёмства з групай, паведамленне аб тэме, мэце экскурсіі, прадстаўленне ўстановы адукацыі аг. Пясочнае | Знаёмства з правіламі паводзін падчас экскурсіі, з парадкам руху, праверка ведаў правіл бяспекі пешаходаў. | Прапанова групе стаць паўкругам, не больш чым у два рады. |
| Пераход да Таполі, пасаджанай ў гонар вучонага, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны С. А. Умрэйкі (4 мінуты) 40 м | | | | | | |
| Аг. Пясочнае. Таполя насупраць гандлёвай плошчы. | Вул. Леніна, 8 | Таполя, пасаджаная ў гонар вучонага С. А. Умрэйкі | 5 хвілін | “Таполя Умрэйкі”<br>С. А. Умрэйка – савецкі вучоны, педагог, грамадзянін.<br>Яго імя носіць Песачанская ўстанова адукацыі. Значны ўкладС. А. Умрэйкі для развіцця Пясочнага пасля вайны. | Група, якая становіцца паўкругам, знаёміцца са старонкамі біяграфіі і асобай аднаго з арганізатараў народнай асветы ў БССР, аднаго з самых паважаных | Размяшчэнне паўкругам, не больш чым у два рады.<br>Выкарыстоўваюцца прыемы паказу і апаведу. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | людзей у Пясочным.Члены групы могуць зрабіць фотаздымкі на фоне магутнага дрэва. | |
| Пераход (4 мінуты) 40 м | | | | | | |
| Аг. Пясочнае | Плошча з правага боку Песачанскага цэнтра культуры і дасугу (вул. Леніна, 11) | Мемарыяльны комплекс (брацкія могілкі, помнік “Смуткуючая маці”, мемарыяльныя пліты з імёнамі загінуўшых змагароў і мірных жыхароў) | 15 мін | “Пясочнае – партызанская Масква”<br>Верш А. Русака “Пясоцкім партызанам”<br>Брацкія магілы.<br>Мемарыяльная дошка<br>Мітынг у Дзень Перамогі<br>Кніга А. Я. Умрэйкі “Записки о родине” | Група размяшчаецца перад тэрыторыяй вайсковага пахавання, пасля аповеду экскурсавода – на тэрыторыі. | Аповед.Агляд.Дэкламацыя верша падрыхтаваным навучэнцам. Адказы на пытанні. Суразмоўніцтва. Хвіліна маўчання. |
| Пераход (3 мінуты) 20 м | | | | | | |
| Аг. Пясочнае | Плошча перад Песачанскім цэнтрам культуры і дасугу (вул. Леніна, 11) | Мемарыяльная дошка на месцы масавага растрэлу членаў партызанскіх сем’яў | 4 мінуты | “Гэта было 5 студзеня 1943 года…”<br><br>У той дзень фашысты зверскі расправіліся з партызанскімі сям’ямі – загінулі 30 дарослых і 13 дзяцей. | Група размяшчаецца паўкругам перад мемарыяльнай дошкай. | Аповед. Хвіліна маўчання. |
| Пераход (30 минут) 300 м. | | | | | | |
| Аг. Пясочнае | Песачанскія могілкі | Помнік на магіле ўдзельніка | 10 мінут | Слава пра партызанаў, загінуўшых падчас | Група размяшчаецца насупраць і па | Аповед. Дэкламацыя верша А. Русака |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лаўскага бою Астрэйкі В. М. | | Лаўскага бою, пракацілася па ўсёй Беларусі. Герояў было васямнаццаць. Адзін з іх – ураджэнец Пясочнага Астрэйка В. М. | баках помніка. | “Лаўскі бой” падрыхтаваным вучнем. Зачытванне успамінаў сястры партызана Сасінай Н. М. Ускладанне кветак на магілу героя. |
| Пераход (30 мінут) 300 м | | | | | | |
| Адпачынак ва ўстанове адукацыі. Арганізацыя чайнай паўзы. (15 мінут) | | | | | | |
| Аг. Пясочнае 2-і паверх ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі”. | Краязнаўчы музей установы адукацыі | Экспазіцыя, прысвечаная паэту-песенніку Адаму Русаку Музычныя інструменты, асабістыя рэчы, фота і рукапісы Адама Русака | 15 мінут | “Паэт-песеннік і музыкант Адам Русак”<br><br>“Лясная песня” – партызанскі гімн. | Група размяшчаецца паўкругам ля экспазіцыі, прысвечанай Адаму Русаку, пасля пераходзіць у вучэбны клас, дзе садзіцца для прагляду відэаматэрыялаў | Выкарыстоўваюцца прыемы паказу і аповеду.<br><br>Экскурсія праводзіцца з праглядам відэазапісу. |
| Аг. Пясочнае 2-і паверх ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. | Краязнаўчы музей установы адукацыі | Экспазіцыя, прысвечаная паэту-песенніку Анатолю Астрэйку | 8 мінут | “Анатоль Астрэйка – беларускі Есенін”<br><br>“Слуцкі пояс”- кніжка-партызанка.<br>Газета-плакат “Раздавім фашысцкую гадзіну”<br>“Песня пра Нёман” | Група размяшчаецца паўкругам ля экспазіцыі, прысвечанай Анатолю Астрэйку | Выкарыстоўваюцца прыемы паказу і аповеду. Праслухванне аўдыёзапісу “Песні пра Нёман” на словы А. Астрэйкі. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Умрэйкі”. | | | | | | |
| Аг. Пясочнае 2-і паверх ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі”. | Краязнаўчы музей установы адукацыі | Экспазіцыя “Пясочнае ў гады Вялікай Айчыннай вайны” | 5 мінут | “Нашы героі” “Піянеры-героі” “Знаходкі з месцаў былых баёў” | Адвольнае месцазнаходжанне ўдзельнікаў. | Самастойны агляд экспанатаў |
| **Пераход** (3 хвіліны) 20 м | | | | | | |
| Аг. Пясочнае ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі”. | Фае ўстановы адукацыі | - | 7 мінут | Заключэнне. | Падвядзенне вынікаў экскурсіі, адказ на пытанні ўдзельнікаў. Прапанова пакінуць водзыў. Падзяка за ўвагу. | Адвольнае размяшчэнне групы. Кнігі водзываў музея. |



Фота 1. Аг. Пясочнае. ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі”.





Фота 2, 3. Ля помніка “Смуткуючая маці”



Фота 4. Таполя, пасаджаная школьнікамі

ў гонар вучонага, удзельніка ВАВ С. А. Умрэйкі




Фота 5. Краязнаўчы музей ўстановы адукацыі.

Ля экспазіцыі, прысвечанай Адаму Русаку




Фота 6. Краязнаўчы музей ўстановы адукацыі.

Экспазіцыя, прысвечаная Анатолю Астрэйку.




Фота 7 . Мемарыяльныя пліты ля помніка “Смуткуючая маці”